# «Заранiца»

## Літаратурная старонка

Надзея ПАРЧУК, г. Брэст

### Першасловы

*Шануй святое слова "маці",*
*Як залацінкай даражы,*
*Бо ад яе ўсмешкі ў хаце*
*Святлее, промніцца ў душы.*

*Прыветны свет, жыццё лагодзіць,*
*Знікае ў сэрцы сум-разлад,*
*Бы сонца, зноў надзея ўсходзіць*
*Пасля матуліных парад.*

*Нам гэта лёгка і прыемна*
*З матуляй гутарыць сваёй.*
*І не спрабуй схлусіць – дарэмна:*
*Ты нібы шкельца перад ёй.*

*Адчуе маці бездакорна*
*Няшчырасць роднае душы*
*І скажа ціха, памяркоўна:*
*"Дзіцятка, лепей не грашы!"*

*Пасля матулінай замовы*
*Анёлак дорыць нам спакой...*
*"Матуля", "маці" – першасловы*
*Гучаць спрадвечна над зямлёй.*

### Напамін

*Яшчэ, мой дружа, ты шчаслівы,*
*Калі матуля, тата ёсць;*
*Пакуль яны ў цябе жывыя –*
*З табою радасць, маладосць.*

*Пакуль яны – на гэтым свеце,*
*Дык ты для іх – заўжды дзіцё...*
*Павер: няма на ўсёй планеце*
*Людзей з больш шчырым пачуццём.*

*Кім ты б ні стаў – ім застаешся,*
*Сыночкам родным ці дачкой.*
*Чаму ж тады не прызнаешся*
*Бацькам у любасці сваёй?*

*Няўжо лягчэй сказаць благое,*
*Чым вымавіць: "Я вас люблю!.."*
*Альбо з малітваю святою*
*Звярнуцца: "Божа, дай, малю,*

*Здароўя татачку і мамцы,*
*Пашлі ім доўгія гады,*
*Каб мне было з кім павітацца,*
*Было прыехаць мне куды..."*

*Сябры мае! Бацькоў шануйце.*
*Вам Богам дадзены яны.*
*Не дакарайце, не крыўдуйце,*
*Калі вы існыя сыны.*

*Дзе б ні жылі вы, ні хадзілі,*
*А цвёрда помніце заўжды:*
*Яны на свет вас нарадзілі,*
*Каб іх прадоўжылі гады.*

## Святы абсяг

*Перада мной – святы абсяг*
*Майго раздольнага Палесся,*
*Мая тут Бацькаўшчына ўся*
*З цудоўнай мовай, звонкай песняй.*

*Тут нарадзіліся калісь*
*Мае бабулі, прадзядулі.*
*Іх бласлаўляла гэта высь,*
*Малітвы іх нябёсы чулі.*

*Палескі мой святы абсяг,*
*Не разлюбіць цябе ніколі.*
*Лячу сюды, каб у гасцях*
*Табой надыхацца ўволю.*